# ГЛЫБОКАЕ:
# Дзень беларускага пісьменства і друку














Створаная агульнымі намаганнямі атмасфера свята дазволіла рэальна акунуцца ў гісторыю пісьменства.

Праз два гады Глыбокае адзначыць 600-годдзе з часу першага ўпамінання ў друкаваных крыніцах. У 1414 годзе гэта было мястэчка, якое знаходзілася ў атачэнні азёр Кагальнае і Вялікае. З Вялікага возера выцякала рака Бярозаўка, якая падзяляла горад на дзве часткі. Яны належалі двум магнацкім родам. Большую частку займаў маёнтак Зяновічаў, ён уваходзіў у Віленскае ваяводства. Меншай валодалі Корсакі, іх частка адносілася да Полацкага ваяводства. Ці то розная прыналежнасць зямель, ці індывідуальныя рысы характараў уладальнікаў паўплывалі на тое, што яны пастаянна спаборнічалі паміж сабой. Невялікае, але глыбокае возера паміж іх уладаннямі і дало назву гораду. Іосіф Корсак застаўся ў гісторыі як мецэнат, які на свае сродкі ўзвёў комплекс манастыра кармелітаў з касцёлам Успення Багародзіцы — цяпер гэта праваслаўны сабор, помнік архітэктуры XVII стагоддзя рэспубліканскага значэння, які прадстаўляе ранняе барока ў Беларусі. Адметнасць горада ў тым, што ў цэнтры яго побач знаходзяцца гэтая царква і касцёл святой Тройцы — помнік архітэктуры XVIII стагоддзя. 1 верасня, у Дзень ведаў, у Глыбокае прыбыла Рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя "Дарога да Святыняў" з Благадатным Агнём ад Труны Гасподняй, якая стартавала ў Мінску 29 жніўня. У кафедральным саборы Нараджэння Прасвятой Багародзіцы адбылася літургія ў гонар падзеі. Гэты агонь духоўнасці сімвалізуе не толькі хрысціянскую веру, але і першы друкаваны твор — "Біблію", якую падараваў свайму і суседнім народам першадрукар Францыск Скарына — "людем посполитым к доброму научению".

Сёлета Глыбокае стала сталіцай XIX па ліку свята Дня беларускага пісьменства і друку, якое ў нашай краіне праводзіцца з 1994 года. Тут пабывалі госці з 20 краін свету. На Віцебшчыне свята прайшло ў пяты раз.





17 верасня ўсе вуліцы Глыбокага былі шчыльна запоўнены ўдзельнікамі свята.

А запачаткаваў традыцыю старажытны Полацк, радзіма вялікіх асветнікаў і культурная сталіца краіны. Глыбочына таксама мае знакамітых дзеячаў культуры, навукі і мастацтва, якія шчыравалі ў розных галінах ведаў. Падчас свята ў гарадскім скверы была адкрыта алея знакамітых землякоў глыбачан. На ёй устаноўлена восем бюстаў: мецэнату горада Іосіфу Корсаку; заснавальніку беларускага тэатра Ігнату Буйніцкаму; мастаку, пісьменніку, археолагу і фалькларысту Язэпу Драздовічу; публіцысту, пісьменніку і гісторыку, дырэктару першага Беларускага дзяржаўнага музея, акадэміку АН БССР Вацлаву Ластоўскаму; паэту Алесю Дубровічу; герою Савецкага Саюза Пятру Казлову; генеральнаму канструктару авіяцыйнай тэхнікі Паўлу Сухому; Лазару Перальману — стваральніку сучаснай мовы іўрыт дзяржавы Ізраіль. Была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар пісьменніка Лявонція Ракоўскага і архітэктара Клаўдзія Дуж-Душэўскага.

Свята пісьменства ў Глыбокім было вельмі насычаным рознымі значнымі падзеямі. Яно прысвячалася Году кнігі, і ў памяць пра гэта быў устаноўлены знак "Прысвячэнне кнізе", аўтар якога — Аляксандр Хітроў. З усёй кніжнай прадукцыі, якая выпускаецца ў нашай краіне, на кожнага жыхара Беларусі прыходзіцца 4 кнігі. Як і ва ўсім свеце, моцны ўплыў на людзей аказваюць электронныя СМІ. Аднак гэты вельмі значны інфармацыйны даведнік ніякім чынам не замяняе чытанне кніг, якое патрабуе ўдумлівасці, няспешнасці, працы розуму, узбагачае пачуцці і жыццёвы вопыт. Такія кнігі, напісаныя на вякі, пакінулі нам у спадчыну класікі беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас. Прэзентацыя альбома "Беларусь. Зямля песняроў", прысвечанага іх творчасці і мясцінам, дзе яны жылі і тварылі, таксама адбылася падчас свята (выдавецтва "Беларусь", аўтар Анатоль Кляшчук).Нацыянальная бібліятэка Беларусі арганізавала выстаўку-прэзентацыю "Паэтычная гасцёўня" у гонар народных паэтаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка. Былі ўзнагароджаны лепшыя бібліятэкары і адзначаны лепшыя бібліятэкі. Друкаваныя рарытэты з фондаў Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і выстава гісторыі пісьменства "Ад берасцяной граматы да Інтэрнэта" Віцебскага абласнога краязнаўчага музея таксама былі прысвечаны Году кнігі.

Артысты Купалаўскага тэатра парадавалі гледачоў, паказаўшы ўрывак з п'есы "Паўлінка" ў тэатралізаванай дзеі "Вытокі духоўнасці". У гэтай дзеі асабліва запомніўся дыялог традыцыйнай і сучаснай кнігі, якія спрачаліся наконт сваёй значнасці ў наш час. Традыцыйная кніга прадстаўлена глыбокай, удумлівай, разумнай — яна захоўвае значныя духоўныя каштоўнасці, створаныя чалавецтвам. Бадай, самыя актыўныя чытачы сёння — гэта школьнікі і студэнты. Сімвалічна іх увасобілі юныя глыбачане, якія занялі месцы перад сцэнай на цэнтральнай плошчы горада, дзе адбываліся асноўныя афіцыйныя падзеі. Самыя значныя з іх — урачыстае адкрыццё, вітанні Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі і Мітрапаліта Філарэта ўдзельнікам і гасцям свята, якія былі зачытаны афіцыйнымі асобамі (дарэчы, усе выступленні прагучалі па-беларуску), узнагароджанне пісьменнікаў – пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор у 10 намінацыях, былі адзначаны таксама пераможцы конкурсу юных чытальнікаў Глыбоцкага раёна па творах класікаў беларускай літаратуры. Напярэдадні адбыўся Міжнародны круглы стол з удзелам беларускіх і замежных пісьменнікаў з сямі краін свету, а таксама навукова-практычная канферэнцыя "Глыбоцкія чытанні". Фальклорным святам і выставай у Празароках ушанoўвалі памяць Ігната Буйніцкага, які тут нарадзіўся.

Усе вуліцы Глыбокага, якія разыходзяцца радыяльна ад цэнтральнай плошчы, 17 верасня былі шчыльна запоўнены ўдзельнікамі свята. Выставы СМІ і выдавецтваў, сустрэчы з чытачамі, пленэр імя Язэпа Драздовіча, тэатралізаваныя прадстаўленні, канцэрты, спектаклі, конкурсы ... Кожная вуліца мела сваю тэматычную назву: Альгердаў Тракт, тракты "Шчодрыца", "Турыстычны", "Ад агню да пяра". І на кожным — мноства цікавых панадворкаў. Свята завяршылася феерверкам і пакінула незабыўныя ўражанні, асэнсаванне вялікага значэння Кнігі ў нашым жыцці, дазволіла рэальна акунуцца ў гісторыю пісьменства і адчуць яго ў сваёй гістарычнай памяці як неабходную частку сучаснага жыцця і культурных традыцый мінулага.

**Рэгіна ГАМЗОВІЧ.**

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА і аўтара.**

30к 1844 - 1
Нацыянальная бібліятэка Беларусі